Сучасная архітэктурная народная творчасць даўно ўжо страціла сэнсавую канву “ахоўнага” значэння сімвалаў, але бачанне прыгожага перадаецца ў спадчыну. На пытанне, дзеля чаго робяцца падобныя аздабленні або што яны азначаюць, майстры або гаспадары звычайна адказваюць: каб было прыгожа.

Задача ўсіх, хто звязаны ў наш час з будаўніцтвам і праектаваннем асобных дамоў і цэлых паселішчаў, – не разглядаць падобныя элементы дэкору, як нешта аджылае, старое, а уважліва ставіцца да рэгіянальнай архітэктурнай спадчыны і нават пры масавым праектаванні і будаўніцтве імкнуцца ствараць лакальна своеасаблівы дэкарытыўны воблік будынкаў. Менавіта цяпер, калі адбываецца вялікая перабудова калгаснай вескі, важна, каб эстэтычныя мясцовыя народныя традыцыі не зніклі бясследна, а ў мудрым майстэрстве народа, у стваральнай працы архітэктараў і мастакоў працягвалі сваё жыццё на радасць патомкам.

**Літаратура**


1. Никольский, Н.М. Дохристианские верования и культы днепровских славян. – М., 1929.
2. Нікольскі, М.М. Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства. – Мінск, 1933.
3. Сербов, И.А. Поездки по Полесью 1911 и 1912 гг. – Вильно, 1914.
4. Даркевич, В.П. Символы небесных светил в орнаментике Древней Руси. – «Советская археология». – 1980. – № 4.
5. Матэрыялы экспедыцыйных паездак аўтара (І.П. Хіцько) па ўсіх раёнах Беларусі ў 70–90 гг. XX ст.


● ● ● ● ●

УДК 75.036(476.5)

## ПАМЯЦІ ТАЛЕНАВІТАГА МАСТАКА М.Ф. ГЛУШКО


***Шкут М.М.***

*ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*


***Ключавыя словы:*** *мастацтва, эцюды, карціна, мастак-рэаліст, вясковыя краявіды, кампазіцыя, традыцыі.*

10 мая 1998 года датэрмінова абарвалася жыццё таленавітага жывапісца Міхася Федаравіча Глушко, жыццё мастака, поўнага росквіту і творчых здзяйсненняў. У гэтым годзе (2014) яму бы споўнілась 70 год. Здольны, працавіты, шматгранны, мэтанакіраванымастак не паспеў стварыць занадта шмат. Але, тое што створана ім трывала ўвайшло ў скарбніцу віцебскай мастацкай школы.

Калі знаёмішся з творчасцю сябра Саюза мастакоў СССР жывапісца М. Глушко, міжвольна адчуваеш прывабнасць яго сціплай непрэтэнцыёзнай жывапіснай манеры, пазбаўленай эфекта і напышлівай прыўзнятасці. Мастак выношвае шмат задум, каб перадаць на палатне беларускі край, цудоўны край віцебшчыны з блакітнымі азёрамі і рэкамі.

З самага пачатку творчага шляху М. Глушко шмат працуе над тэматычнымі творамі. Тут і камерныя бытавыя матывы, і карціны, напісаныя на стыку жанра і партрэта, і станковыя трыпціхі, пейзажы. Аб’ядноўвае іх неуклоннае імкненне аўтара паказаць развёрнутую карціну народнага быта і народнага характара ў іх неразрыўных сувязях з вядучымі тэндэнцыямі нашай рэчаіснасці. А гэта адзначае, што мастак



Рэпазіторый ВДУ

нераздзельны ад жыцця свайго народа, пільна углядаееца ва ўсё новае, што ў ім адбываецца, і дае аб ім сваё меркаванне.

Першая карціна М. Глушко "Падзел зямлі", датуемая 1970 годам, яшчэ выстаўленая на суд гледача ў віцебскім выставачным зале, яшчэ цемнавата па жывапісу, не пазбаўлена прафесійна-тэхнічных памылак, аднак адзначаецца цэльнай задумкай і змястоўнасцю тэмы. Гэты невялікі поспех першай карціны, напісанай пасля заканчэння ў 1970 годзе мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава, не змог не акрыліць будучага жывапісца. Яго творчы шлях быў нялёгкі. І гэта заканамерна. Не было ў яго той сапраўднай школы, якая ствараецца ні ў час навучання, а толькі ў майстэрні, дзякуючы штодзённай, крапатлівай, самастойнай працы над стварэннем твораў. Яго твоорчасць набірае сілу паступова, ён не здавальняецца дасягнутым і ставіць перад сабою новыя, болей складаныя творчыя задачы.

Галоўным настаўнікам і дарадчыкам мастака з'яўляецца прырода, асабліва вясковыя краявіды, дзе прайшло яго нялёгкае дзяцінства. М. Глушко паходзіць з вёскі Буда, што на Сенненшчыне. Асаблівага поспеху мастак дабіваецца ў жанры лірычнага пейзажу. Тут праяўляецца яго шчырая любоў да лясоў, галубых азёр Віцебшчыны. Адна з іх – карціна "Аршанскі пейзаж " (1971). Гэта тэма радасці жыцця, шчасце любавацца роднай прыродай, белымі бярозамі і квітнеючым льном. Да гэтага твора мастак робіць шмат замалёвак, кароткіх і працяглых эцюдаў у розны час надвор'я. М. Глушко – мастак-рэаліст. Яго пейзажы розныя па сваім памерам, але шчыра прапісаны дробнымі, плаўнымі мазкамі, перадаючы і фактуру выяўляемага, і прзрыстасць паветра, і шчыры настрой самога мастака, падрыхтоўваючы гледача на асаблівы меладычны лад. Гэта назіраецца ў творах: "Лён", "Лясная паляна", "Возера", "Позняя восень", "Першы снег", "Пануры дзень", "Хлеба", "Адліга", "Акраіна", "Вясна", "Зімні акорд", "Вечар", "Азёрны край", "Зацвіла вярба", "Летняя сонца", створаныя за дзесяцігоддзе творчай працы.

У пейзажы "Лепельскі край" мастак здолеў цэласны і глыбокі вобраз беларускай прыроды, адлюстраваць яе адвечную прыгажосць. Красамоўныя рытмы блакітных лясоў удалечыні з залаціста-асеннімі пералескамі на велічных узгорках шчодра вабяць гледача. Карціна пабудавана на прымяненні карычневых, чырвоных фарбаў. Мастак выкарыстоўвае лесіроўку, дзякуючы гэтаму прыёму аб'ядноўваецца каляровая гама і надаецца празрысты адценак. Гэты твор дае нам магчымасць меркаваць аб новых індывідуальных пошуках мастака, што яскрава праўляецца сакавітай жывапіснай манеры пісьма, пазбаўленай усякай вычварнасці. Новы падыход М. Глушко да паказу прыроды, таксама ярка праяўляецца ў пейзажы "Памятные мясціны", дзе ўдала знойдзены жывапісны стан і актыўная сіла колеру.

Мастацтва М. Глушко, мы не памылімся сказаць аб гэтым, шчырае і паэтычнае, яно складае частку віцебскага пейзажнага жывапісу. Яго творы вытрыманы ў лепшых традыцыях рэалістычнага пейзажу, якія паэтычна апяваюць прыгажосць роднай прыроды, атрымліваюць прызванне гледача. Аб гэтым сведчаць алейныя пейзажы "Лён цвіце", "Лясны роў", "Вясна над палямі", "Зубры", "Грэчка", "Віцебскі матыў", "Цвітуць сады", "Яблынька", "Світанне", "Перад бурай", выкананыя ў канцы 80-х гадоў.

Мастак імкнецца ў пейзажах выразіць задумы і пачуцці, стварыць вобразы роднага края. Ён крапатліва вядзе пошукі новых выразных мастацкіх сродкаў, дапамагаючы яму па-новаму адлюстраваць акружаючую рэчаіснасць. Варта нам адзначыць, што на творчасці М. Глушко выразна адлюстроўваецца значны ўплыў яго былога шчырага настаўніка, старэйшага віцебскага мастака-педагога, жывапісца А.В. Гаўрушкі, які клапаціўся аб падрыхтоўцы сваіх паслядоўнікаў, якія маглі б працягваць традыцыі віцебскай мастацкай школы.

Рэпазіторый ВДУ

М. Глушко яшчэ ў студэнцкія гады з вялікай зацікаўленасцю крапатліва вывучае творчасць шматлікіх вядомых рускіх мастакоў, асабіста захапляўся творамі К.А. Каровіна, А.А. Пластова, а таксама і сучасных беларускіх жывапісцаў П.В. Масленікава, І.П. Рэя, П.В. Свентахоўскага і іншых.

Параўноўваючы творы М. Глушко 70-х гадоў з палотнамі апошняга часу, бачым, як крок за крокам рэалізуе ён свае творчыя магчымасці, старанна і скурпулёзна ставячыся як да тэматычнай карціны, так і да пейзажа, дзе заўсёды імкнецца да яркай выразнай мастацкай формы. Прастата выяўленчых прыёмаў мастака, натуральнасць жывапіснай мовы, шчырасць і глыбіня ўражання робяць яго пейзажы змястоўнымі. Выкарыстоўваючы лепшыя дасягненні майстроў старэйшага пакалення, ён абагачае пейзаж новым зместам, новымі эмоцыямі, імкнецца да філасофскага роздуму аб прыродзе, часе, аб цікавых і незабыўных падзеях.

Мастак працуе шмат і настойліва. Грунтоўная повязь з жыццём, адданасць справе беларускага народа уласцівы лепшым творам М. Глушко. Яго героі – калгаснікі, рабочыя, байцы ўзброенных сіл, партызаны.Кожнае наведанне твораў мастака дае магчымасць па-новаму з вялікай асалодай і натхненнем разглядаць іх у любы час, калі ні заходзіш да яго ў майстэрню, можна заўсёды застаць мастака за працай над жанравай карцінай ці вясковым пейзажам.

У апошнія гады ўсё большую ўвагу мастака прыцягваюць гістарычныя творы, якія ўслаўляюць моц і веліч народа. Тэма Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца адной з галоўных тэм мастака. Праз яе М. Глушко імкнецца паказаць веліч народнага подзвігу. Ён стварае цэлыя серыі, змястоўныя кампазіцыі Вялікія шырыня палотнаў, напоўненасць іх канкрэтна-гістарычным зместам, уласціва для яго твоорчасці. Адна з лепшых – карціна "Ні кроку назад", якая мае пэўныя рысы манументальнасці за кошт удалай кампазіцыйнай пабудовы кантрастных планаў, некаторай жорсткасцю колеравай гамы. Сімвалічнае гучанне адлюстроўваецца на тварах байцоў, якія і не думаюць адступаць, а толькі ісці з боем уперад.

Мастак стварыў шмат палотнаў, у якіх аджлюстроўваецца тэма гераічнага. Працуючы над мастацкімі вобразамі, М. Глушко абапіраецца на канкрэтны архіўны матэрыял, жывых сведак, якія бачылі жахі вайны. Гістарычнасць факта, канкрэтная даставернасць – характэрныя рысы мастака, якія адлюстраваны пры стварэнні твораў аб Героях Савецкага Саюза Юрыю Смірнове "Бой за зямлю" і Косці Абазоўскага "Нябесны арол".

Пластычны і жывапісны лад палатна "Суражскак апалчэнне" трывала ўвайшла ў сэрцы гледачоў, дзе кожны вобраз канкрэтны і па-мастакоўску абагулены, накіраваны на сцвярджэння мужнасці і нязломнасці абароцаў сваёй Радзімы. Кожнае новае палатно нясе свае цяжкасці. Як напрыклад, пазбегнуць рыторыкі, банальнасці агульных месц у творы, прысвечанай подзвігу савецкіх салдат? М. Глушко знаходзіць цікавы мастацкі прыём. У карціне "Пераправа" наблюдаецца рашучая перавага над шматфігурнымі кампазіцыямі, дзе занадта дэталізуецца кожны вобраз. Тут падзеі вайны паказаны з строгай гістарычнай дакументальнасцю. Тут падзеі вайны падыход твора вырашан творча, даведзен да вобразнага гучання, у вобразах свацкіх байцоў паказ іх патрыятызм, згуртаванасць і высокі дух калектывізму. Мастака хвалюе стварэнне абагуленага вобраза, у якім ён імкнецца ўвасобіць сімвал духоўнай стойкасці савецкага салдата.

Крапатлівыя пошукі манументальнай кампазіцыі і вострай псіхалагічнай характарыстыкі прыкметны ў карціне "Генерал даватар". У выразна акрэсленым сілуэце фігуры, у энергічным малюнку твара Героя Савецкага Саюза генерал-маёра Л.М. Даватара раскрываецца суровы, валявы характар загартаванага ў баях палкаводца. М. Глушко перадаў кантраст знешняга спакойства, ураўнаважанасці і ўнутранняй напружанасці, парывістасці яго характару. Мастак імкліва падкрэслівае якую-небудзь



Рэпазіторый ВДУ

адну дамінуючую асаблівасць характара чалавека і праз яе раскрывае духуўную сутнасць. Гэта робіць яго творы прадзівымі, выкананымі ў рэалістычных традыцыях савецкага гераічнага партрэта.

У другім творы “Непакорныя” ён імкнецца стварыць агульную трывожную атмасферу тых трагічных нагоў. Зварушліва і пранікнённа напісаны вобразы гэтай карціны. Эмацыянальна-выразная фігура жанчыны з дзіцём на руках, суровыя твары старых жыхароў вёскі. Мастак перадае самые розные душэўныя настроі сабраўшыхся: глубокі смутак, пакорнасць сваему лёсу, аднак у цэнтральная фігуры старыка, моцна сціскаючы свае кулакі, выражан пратэст, які ўзмацняецца ўсімі вобразамі карціны.

У творчасці М. Глушко – мастака сярэдняга пакалення Айчыннай вайны заняла, як нам вядома, галоўнае месца. Яго тэматычны жывапіс развівае і ўзбагачае лепшыя традыцыі беларускага мастацтва ў адлюстраванні гераічнага, у вырашэнні сучасных задач, у глыбокім пераасэсаванні праблем вайны і міру. Мастак сустракаецца з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, партызанамі, наведваў музеі Беларусі, архівы і заўсёды лічыць сваім грамадзянскім абавязкам пісаць карціны пра подзвіг народа ў гады фашысцкай акупацыі. Істотная каштоўнасць яго творчасці сцвярджаецца ў цэльнасці і яснасці жывапіснай мовы, абгрунтаванай у пластычных і каларыстычных адносінах. Ён па-свойму трактуе ўзаемасувязь ваенных гадоў і сягодняшняга ў марах сучасніка.

Адна з характэрных прыкмет яго творчай індывідуальнасці ў тым, што ў М. Глушко задумы рэалізуюцца раптоўна. Гэта ні кожнаму мастаку дано. Спачатку ён выконвае натурныя алейныя накіды, якія пасля ператвараюцца ў манумянтальныя палотны. Яго накіды і эскізы будучых карцін вызначаюцца пэўнымі мастацкімі вартасцямі. Аднак не ўсе пошукі мастака задавальнялі яго. Мастак стварыў больш 80 работ за такі кароткі тэрмін. Яго майстэрства мацнее з гадамі. Гэта прыкметна на такіх яго работах, як “Незабыўнае”, “Партызаны”, цікавых па кампазіцыйнаму рашэнню, з выразнай жывапіснай намай. Гэтыя палотны з’яўляюцца этапнымі для твоорчасці жывапісца.

Працуючы ў традыцыйным плане ён прыдае сваім творм мастацкую выразнасць, ідэйна-вобразную завершанасць. Аб гэтым сведчыць яго твор “Суражскае апалчэнне” у якіім яскрава адчуваецца крапатлівы шлях глыбокага вывучэння жыцця, пошукаў тых мастацкіх сродкаў, якія надаюць яго палотнам рэалістычную вобразнасць, рысы аўтарскай індывідуальнасці. Гэты твор пераканальны, прасякнуты пачуццём высакароднага гонару за родную зямлю і яе народ, які гераічна выстаяў у гады вайны.

М. Глушко таксама і партрэтыст. Ён знаходзіць доступ к чалавечнаму сэрцу, уразумее сабе ўсё добрае, галоўнае, штог ёсць у кожным чаловеку. Гэта даверчывая адкрытасць пачуцця ў сціплым, простым па жывапісу партрэце М. цурана былога дырэктара саўгаса імя П.М. Машэрава Сененскага раёна. Дабрата, якую не зможа пахіснуць цяжкасць пражытых год адлюстраваны ў партрэце “Маці”.

Глыбока і пранікнённа раскрывае мастак у сваіх партрэтах характары сучаснікаў – “Народны артыст БССР Т. Кокштыс”, “Ваенны лётчык В.Лернатовіч”, “Каханая жонка”, “Света і Алёна”, “Бабуля”, “Сябры”, дзе з вялікай глыбінёй усебакова раскрыў унутраныя рысы блізкіх для яго людзей. Яго партрэты – дасканальныя па форме, разнастайныя па зместу, дэталёва распрацаваныя, інтэлектуальна-эмацыянальныя. І безумоўна, пра яго творы спрачаюцца, яго твораў чакалі.

У творчасці М. Глушко няма какецтва нацыянальнай экзотыкай, ні эстэтызацыі патрыяльхальнага быта. Гэта цікавыя, самастойныя, тонкія па нацыянальнаму каларыту творы, адзначаныя дыханнем сучаснасці. Ён любіць вандраваць з эцюднікам вывучаючы краявіды Віцебшчыны. Створаныя ім пейзажныя эцюды на пленэры, галоўным чынам, становяцця завершанымі творамі без дапрацовак у майстэрні. Мастак не імкнецца паразіць гледача навізной матываў малюнка. Яму значна даражэй была



Репозиторий ВГУ

перадаць тое адчуванне ўбачанага, здзіўлення, душэўнай цяплыні, якую ён адчуў пры сустрэчы з незнаёмымі людзьмі, незнаёмымі месцамі па жывапісным узгоркам Венгрыі ў час паездкі з Усесаюзнай групай Камітэта міра ў 1985 годзе. Час для мастака не прайшоў дарма. Ён прывозіць шмат замалёвак алоўкам, пяром, накідаў людзей розных па прафесіі, у тым ліку і партрэт лётчыка-касманаўта СССР К.П. Феакцістава. Амаль на кожным малюнку стаіць аўтограф касманаўта і М. Глушко гэтым вельмі ганарыўся.

Расказ аб творчым шляху пра віцебскага мастака М. Глушко быў бы няпоўны, калі ні сказаць аб той каласальнай працы, якая зроблена ім у галіне панарамна-дыярамнага мастацтва. У творах панарамна-дыярамнага жывапісу знайшлі адлюстраванне гераічныя старонкі часоў Вялікай Айчыннай вайны, флора і фауна Бярэзінскага запаведніка. Яго з вялікім жаданнем запрашалі распрацоўваць накіды, макеты і прынімаць твоорчы ўдзел у мастацкім афармленні музея прыроды ў в. Домжарыцы Лепельскага раёна, музея біясфернага Бярэзінскага запаведніка, музея Народнай славы ў г.п. Шуміліна, Лепелі і іншых. Яго жывапісныя творы знаходзяцца ў музеі Бягомальскай СШ № 2, музеі СПТВ г.п. Улла, музеі Народнай славы г. Бешанковіч, Гарадка і іншых музеях вобласці. Шмат сваіх жывапісных палотнаў мастак перадаў у фонд міру, частным аматарам алейнага жывапісу.

Кожную раніцу мастак спяшаўся ў сваю творчую майстэрню, дзе так старанна ён працаваў над мастацкімі творамі, у якіх увасабляецца вялікая любоў да мастацтва. У майстэрні мастака была шмат новых твораў. Некаторыя з іх так і не завершаны, чакалі сваей чаргі. Аднак і на той стадыі можна меркаваць пра іх цеплыню колераў, якія нясуцб у сабе багацце адценняў, нюансу, найтанчэйшых пераходаў тону.

Такім чынам, творчасць М. Глушко сцвярджае рэалістычныя прынцыпы мастацтва. Яго жывапісныя пейзажы, тэматычныя палотны пранікнуты глыбокай эмацыянальнасцю і дакументальнай праўдзівасцю. Апошнія мастацкія выстаўкі ў Маскве, Мінску, Віцебску, Полацку, а таксама ў Польшы і другіх месцах сведчаць пра вялікі творчы поспех жывапісца М. Глушко – аднаго з прадаўжальнікаў традыцый віцебскай мастацкай школы, былога выпускніка мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава

● ● ● ● ●

УДК 378.147;747:378.036

## ТВОРЧЕСКОЕ МЫШЛЕНИЕ И ПРОФЕССИОНАЛЬНОЕ РАЗВИТИЕ ДИЗАЙНЕРА

***Шилович Ю.С.***
*ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*

***Ключевые слова**: развитие дизайнера, самообразование и мотивация, творческая деятельность, поиск вдохновения, генерация идей, идеальное решение.*

*«Не думаю, что думать можно научить любого. Но каждого пятого – можно. А каждого второго из каждого пятого можно научить придумывать то, что называется дизайном».*

Важнейшей особенностью дизайнера является умение генерировать идеи и воплощать их, будь это графический дизайн, дизайн интерьера или веб-дизайн.

Сложность заключается в том, что в дизайне нет жестких правил. Если бы хороший дизайн сводился к ограниченному набору четких правил, то художников и дизайнеров уже давно вытеснили бы компьютеры, а все рекламные буклеты, книги, брошю-



Репозиторий ВГУ